Самапомач Самаромач

Беларуская Коопэратыўна Гаспадарчая Часопісь

Год II. | Вільня, Красавік 1933 г. | № 4(7).

Хай злыдні над намі,
скрыгочуць зубамі
Любі сваю ніву, свой
край,
І, колькі ёсьць сілы,
да самай магілы
Ары, барануй,
засявай!..

ЯНКА КУПАЛА.



Усе вялікія падзеі народаў і ўсе цывілізацыі былі створаныя дабравольнымі стараньнямі аб'яднаных людзей... самапамаччу

Джордж РЭССЭЛЬ.
(Ірляндзец).



ЗЬМЕСТ № 4 (7).

BIEŁARUSKAJA ABECEDA
Беларуская абэцэда.

A, a — A, a.	H, h — Г, г.	Ł ł, — Л, л.	S, š — Ш, ш
B, b — Б, б.	Ch, ch — X, x.	M, m — M, м.	T, t — T, т.
C, c — Ц, ц.	I, i — I, i.	N, n — H, н.	U, u — У у.
Ć, ć — ЦЬ, ць.	J, j — Й, й.	Ń, ń — НЬ, нь.	Ŭ, ŭ — Ў, ў.
Č, č — Ч, ч.	Ja, ja — Я, я.	O, o — O, o.	V, v — B, в.
D, d, — Д, д.	Je, je — E, e.	P, p — П, п.	У, у — Ы, ы
E, e — Э, э.	Ju, ju — Ю, ю	R, r — P, p.	Z, z — З, з.
F, f — Ф, ф.	K, k — K, к.	S, s — C, c	Ž, ž — Ж, ж.
G, g — Г, г.	L, l — ЛЬ, ль.	Ś, ś — СЬ, сь.	Ź ź — ЗЬ, зь.

Чытайце! Пашырайце! Выпісвайце!

„САМАПОМАЧ“

Беларуская коопэратыўна-Гаспадарчая часопісь.

Выходзіць раз у месяц.

Падпісная плата з перасылкай выносіць:

На год . . . . 3.— зл.
На паўгода . . . . . 1.75 „
На 3 месяцы . . . . . 1.— „
Заграніцу — ўдвая даражэй.

Чынным беларускім культурна-прасьветным арганізацыям, пры выпісваньні на год адразу — на палавіну таней.

Цана асобнага нумару 40 грашоў.
Цана абвестак паводле ўмовы.

Грошы на «Самапомач» пасылаць на чэкавае конто інж. Клімовіча у П.К.О. (Konto czekowe P.K.O.) Nr. 180 485.

Пісьмы і ўсякую карэспандэнцыю перасылаць на адрэс:

Redakcyja „Samapomač“, Vilnia, Połackaja vul 4 10
(Wilno, Połocka 4—10).

Рэдакцыя адчынена ў аўторкі і пятніцы ад 9-ай да 11-ай гадз. дня.

UVAHA: Pry niedaručeńni vypisanaj hazety z pošty treba zaraz-ža žadać vyjaśnieńnia na tej-ža pošcie. I tolki ŭ razie, kali b heta nie pamahło, treba zaraz-ža ab usioj spravie napisać u administracyju „Samapomačy“. Padać pry hetym treba: kali (dakładna padać datu), čamu na jakoj pošcie i jakoha numaru časopisi nia možna było atrymać. Biaz hetycch danych zamienny numar „Samapomačy“ vysyłacca **nia budzie**.

Administracyja „Samapomačy“.

Samapomač

BIEŁARUSKAJA KOOPERATYŪNA - HASPADARČAJA ČASOPIŚ.

Adres:
VILNIA (Wilno), Połackaja vul. 4—10.

Самапомач

Hod II.	Vilnia, Krasavik 1933 h.	Nr. 4 (7).

ČAD PRACHODZIĆ.

Nie ab fizyčnym čadzie tut mova, ale ab duchovym. Aviečy hon, jaki na praciahu apošnich bolš-mienš 15-cioch hadoŭ zahaniaŭ usio miascovaje, biełaruskaje i litoŭskaje, u zaharadku polskaha nacyjanalizmu, pačynaje vidavočna słabieć, a miascami dyk i prosta zamianiajecca ŭ centrabiežnuju da siabie samoha siłu. Zaŭvažyć možna heta siańnia ŭ žyćci kulturnym, palityčnym i, što dla nas tut asabliva važnaje — u žyćci haspadarčym. U niapamiać pajšli ŭžo tyja bajki, što našamu kraju patrebny byccam niejkija mamki dy niańki: prychodziać jany da nas nia z chlebam a z „nažnicami"; stryhuć, pakul dajecca, a paśla— abo sami „pakazvajuć piaty", abo prychodzicca ich prosta vymiatać. —

Pieršyja probłyski svabody paśla lutaŭskaj revalucyi paklikali na biełaruskich ziemlach da samadziejnaha žyćcia cely rad haspadarčych placovak, pieravažna na kooperatyŭnych asnovach. Usie jany amal byli sarhanizovany ŭ krajovym Sajuzie Kooperatyvaŭ u Vilni, hdzie pobač siabie družna i zhodna pracavali biełarusy, litoŭcy i inšyja narody z našych ziamiel. Pryšła adnak „stabilizacyja" paślavajennych dziaržaŭnych formacyjaŭ i šmat z taho, što nia ŭzdoleła da henaj pary apierycca ŭ dziaržaŭnaje pierje, zmušana było ŭ nas pierastać isnavać.

Pierastaŭ isnavać i naš krajovy Sajuz Kooperatyvaŭ. Na miejscy jaho pačali zasnoŭvacca inšyja placoŭki, mocna ŭzaležnienyja ad dalokich polskich centraŭ. Syta jany z hetych centraŭ uspamahalisia, ale zatoje nia mieli apieryšča ŭ našych-ža narodnych masach, dla katorych mielisia isnavać, pracavać... I heta ich „źjeła". Bo čuć tolki dźmuchanuŭ sivier kryzysu, čuć tolki pierastała daić „karoŭka", što hetyja arhanizacyi zradziła, jak usie „niedanoski" pačali admirać... Praces hety adbyvajecca da apošnich dzion i, akramia tych sumnych naśledkaŭ, jak licytacyi za roznyja zabaviazańni i da h. p., maje i adno važnaje dadatniaje ŭzhadavaŭčaje značeńnie: usie navočna pierakonvajucca, što navat dla haspadarčaha žyćcia, kali jano maje być pabudavana na demokratyčnych kooperatyŭnych asnovach, nie chapaje jšče samych tolki hrašej, samoj siły navat palityčnaj. Na heta patrebny jašče **ludzi**, patrebny pryrodnyja i šmat-šmat inš. varunkaŭ, biez jakich usio haspadarčaje žyćcio vyradžajecca.

Konkretna: na paboiščy raźbitaha Sajuzu Kooperatyvaŭ paŭstali ŭ nas až try asiarodki kooperacyi, nie zaŭsiady haspadarčaj, ale zaŭsiady — jak tolki było mahčymym — polskaj, nacyjanalnaj: adzin — spažyviecki i dva — haspadarča-ziemlarobskija. Vilenskija addziely dvuch apošnich centraŭ ŭ samym kancy minułaha m-ca adbyvali ŭ Vilni svaje hadavyja źjezdy, na jakich vykazałasia vielmi vyraznaje śvitańnie ŭ hałovach nia tolki samych učaśnikaŭ źjezdu, zvyčajna — pasyŭnych, ale i ŭ jahonych dziejnych arhanizataraŭ, navat tych, što dziesiać hod tamu ŭsimi siłami staralisia zacierci ŭsiakuju našu asablivaść ad Polščy i kinuć nas u jejnyja abojmy.

Siahońnia ŭsie hetyja ludzi bačuć i baluča adčuvajuć svaju zaležnaść ad centralistyčnaj Varšavy; siahońnia ŭsie razumiejuć, jak lohkamysnym byŭ toj sapraŭdy „avieč̌y hon" „u Varšavu", jaki zamykaje ciapier im prad nosam rachunki i, zasłaniajučysia „handlovym sakretam", zvodzić faktyčna da ničoha ŭsiakuju kantrolu na miejscy. A što najvažniejšaje, siańnia ŭsie pierakonvajucca, jak ciažka im što-niebudź papravić, bo navat prymajučy ŭčaście ŭ naradach Centrali ŭ Varšavie zaŭsiady buduć u mienšaści pierad tamašnimi haspadarami — palakami i pierad nieprachodnymy zaharodkami zaćvierdžanaha statutu.

Usio heta miascovyja kooperatary ŭžo dobra razumiejuć i, jak pakazali nazvanyja źjezdy, pavažna zatrymoŭvujucca nad **patrebaj arhanizavańnia na miejscy svajho ŭłasnaha kooperatyŭnaha centru**, z katoraha-b sami svaimi spravami kiravali. —

— Doraha heta navuka našamu sialanstvu abyšłasia, ale i dobra, što jana ŭreščie trapiła jamu da pierakanańnia. „Adna łastaŭka viasny jšče nia robić" i ad słoŭ moža nia skora prystupiać jašče našy ludzi da dzieła. Ale vyłam užo jość i jon varoža nam śviatlejšuju, sapraŭdy čałavieka hodnuju, bo na našaj-ža samabytnaści apiertuju budučyniu.

Čad prachodzić, treba žyć, treba dzieić.

Nacyja tvorycca nie poŭtarańniem słovaŭ, ale arhanizavańniem sił kraju.

G. RUSSEL.

Volnaja Trybuna.

Jak praciah dumak snutych u Nr. Nr. 2 i 3 „Samapomačy“, źmiaščajem tut dumki dvuch našych supracoŭnikaŭ z pasiarod našaha pieradavoha sialanstva. — red.

I

Kaniešnaja patreba.

Kryzys, jak vialikaje niaščaście čałaviectva, uziaŭ u abojmy cełу śviet i ciśnie asabliva tych, chto nia moža patrapić sarhanizavać svajo žyćcio. Usich cisnuć padatki, tut prapadzie ad niejkaj pošaści skacina, tam hrad vyb'je zbožža i h. d. i h. d. Haspadar-ziemlarob astajecca hetak časta žabrakom, dla jakoha niama ni skul pomačy: pazyčkovyja kasy (pieravažna „Kasy Stefčyka“) prapali jakraz tady, kali ichnaja pomač imienna patrebnaja, a z pryvatnaj ruki brać pazyčku zhaleŭšamu čałavieku siahońnia aznačaje tojesamaje, što čapić žyvomu piatlu na šyju. Hdzie-ž tady vychad dla našaha sielanina mužyka?

Kab papravić budučyniu, treba ścierahčysia pamyłak minuŭščyny i z ich na budučyniu umieć vysnavać navuku. — Z usich hetkich pamyłak tut chaču ŭspomnić tolki ab dźviuch: ab tym, što našy ludzi byccam zabylisia, što asnovaj usiakaha haspadarčaha pačynańnia jość svoj sobski kapitał, dy što pa pazyčku prychodzić i toj, chto na jaje nie zasłužyŭ, chto pierš čym z kasy ŭziać, nie składaŭ u joj svaje aščadnaści. — I adno i druhoje pavinna ad nas vyvieścisia. Heta peŭna. A dziela hetaha pieršym, da čaho treba prystupić, heta arhanizavać z drobnych i najdrabniejšych składak svoj Kooperatyŭny Fond, z jakoha mahli-b čerpać žyćciovyja soki ŭsie inšyja kooperatyŭna-haspadarčyja arhanizacyi i ŭstanovy.

Što da techniki arhanizacyi hetkaha Fondu, dyk padrobnaści pakidaju ludziam, što z hetaj spravaj lepš abaznanyja. Ad siabie ŭvažaŭ-by za patrebnaje tolki zaznačyć niekalki nastupnych pažadańniaŭ:

1. Kooperatyŭny Fond pavinien być pry asnaŭnoj biełaruskaj haspadarčaj arhanizacyi, jakoj musić być Aščadna-pazyčkovaja kasa. Siabry kasy pry ŭstupleńni padpisyvajuć deklaracyju, što praz 10—15 hadoŭ buduć składać na Kooperatyŭny Fond prynamsia 1 zł. u hod, a kali chto moža, dyk i pa niekalki zł. u miesiac. Składki na Kooper. Fond zvaračvajucca svaim ułaśnikam pa 10—15 hadoch.

2. Aščadnaściovyja ŭkłady pavinny być apracentavany choć małym adsotkam.

3. Siabroŭstva ŭ kasie pavinna być dastupnym i najbiadniejšamu. Dziela hetaha siabroŭski paj nia moža być vysoki, dosyć i 5 zł. A kali chto choča i moža, chaj voźmie bolšy lik pajoŭ.

4. Układyvać hrošy ŭ kasu mohuć i niesiabry hetaj kasy, ale pazyčku z kasy moža dastać tolki toj, chto najmienš hod času źjaŭlajecca ŭžo siabram hetaj-ža kasy i maje ŭ joj svaje ŭkłady. Pry kasie dla siabroŭ jejnych isnuje akramia taho dapamahovy Fond na vypadak zahuby skaciny.

Р. Б.

„Маслосоюз“ і „Сільський Господар“ у 1932 г.

„Маслосоюз“ і „Сільський Господар“ гэта дзьве (з 6-цёх) цэнтралі ўкраінскага гаспадарчага жыцьця ў межах сучаснай Польшчы. Абедзьве гэтыя цэнтралі ў канцы м. м-ца (28 і 29 сакавіка) у Львове мелі свае агульныя гадавыя справаздаўчыя сходы, на якіх было падана да публічнага ведама шмат лічбаў і фактаў цікавых і для нашых беларускіх чытачоў. Пераглянем іх з большага прынамся і папарадку.

«Масласаюз» гэта цэнтраля ўкраінскага кооператыўнага малачарства і згуртоўвуе ў сабе ўсе ўкраінскія коопэратыўныя малачарні на зах.-украінскіх землях. Летась сьвяткаваў „Масласаюз“ 25-цілецьце свайго існаваньня. Усе малачарні сарганізаваныя ў „Масласаюзе“ за мін. год вырабілі 2.426.379 кілёграмаў (больш як 242½ вагонаў) масла. З гэтага ліку 2.140.401 кілё (214 вагонаў) масла, або 88.2 проц. ўсей прадукцыі было прадана праз цэнтралю „Масласаюз“ і атрымана за гэта 6.400.000 зл. Сярэдняя гадавая цана, якую „Масласаюз“ плаціў на 1 кілё масла 1-га сорту, вынасіла 2 зл. 99 гр. Пераважная большасьць праданага масла разьмешчана на ўнутраным рынку; заграніцу-ж прадаў „Масласаюз“ за цэлы леташні год толькі 96.696 кілё (няцэлых 10 вагонаў) масла.

У параўнаньні з пазалеташнім (1931) годам, год леташні зазначыўся абніжкай як у даставе масла ў „Масласаюз“ (з 2.428.012 кг. — на 2.140.401 кг., або на 11.8 проц.), так і ў цэнах (з 3.66 зл. за кг. — на 2.99 зл., або на 18.31 проц.). Прычына гэтай абніжкі знаходзіцца ў сучасным крызысе. Затое абніжку гэту «Масласаюз» вынагарадзіў сабе на іншым месцы: сарганізаваў выраб сыроў, брындзы (адпаведна перапрацаваны тварог з авечага малака) і прадажу сьвежага малака. У параўнаньні з 1931 годам выраб сыроў у 1932 г. павялічыўся на 56 проц., брындзы—на 39 проц. За 7.148 кг. сыру вы-ручана 16.892 зл., за 7.725 кг. брындзы — 9.917 зл. Акрамя таго ў справаздаўчым годзе сабрана і прадана праз „Масласаюз“ 2 міл. 899.950 штук яёк і 11.351 кг. мёду. Агульны торг за год выносіў 8.113.148 зл. Усе гандлёвыя агенды Саюзу прынесьлі за год да-

5. Pazyčka ŭ kasie pavinna być abiaśpiečana žyram (parukaj) inšaha siabry, što sam nia maje pazyčki i pa mahčymaści maje svojža ŭkład u kasie.

6. Kasa pavinna być dastupnaj šyrokim kruhom nasielnictva i dziela taho pavinna adčyniać svaje addziely (zbornyja punkty) pa siołach i miastečkach.

7. U haspadarčaj dziejnaści musim apiracca na svaich sobskich siłach i pačynajučy ad samych skromnych pačatkaŭ **vytryvała** jšci da mety — narodnaha dabrabytu. Pomačy ad čužyncaŭ nie spadziavajmosia: chaj tolki jany nam nie pieraškadžajuć.

8. Pokul arhanizavana budzie sama kasa, spravaj Kooper. Fondu musić zaniacca red. ,Samapomačy". *J. Jarmałkovič.*

II.

Nia hrošy, a ludzi!

Ja zhadžajučysia z vyvadami pavažanych aŭtoraŭ dvuch papiarednich artykułaŭ u Nr.Nr. 2 i 3 „Samapomačy" ab patrebie hrašej na arhanizacyju našaj kooperacyi. Ale adnačasna zaścierahajusia prad tym, što ŭ hetaj spravie hrošy heta ŭsio. Susiom nie! Bo kab arhanizacyja kooperacyi ŭ nas sapraŭdy zaležała ad hrašej, dyk sprava stajała-b niezraŭnana lepš. Prynamsia kooperatyvy polskija ŭ nas, što hetulkimi karystalisia dapamohami z boku ŭradu, musili-b sapraŭdy ćviści. A jany tymčasam u bolšaj častcy susim pierastali isnavać, a tyja što byccam isnujuć, viaduć žyćcio jak suchotniki. Znača, u arhanizacyi kooperacyi vialikaje značeńnie maje niešta inšaje jak hrošy: arhanizacyju i samaje isnavańnie kooperacyi padtrymoŭvujuć tut ludzi. U kapitalistyčnych pradpryjemstvach usiu moc majuć hrošy, ale ŭ pradpryjemstvach kooperatyŭnych heta moc apirajecca na ludziach, ci lepš — na ichnaj śviedamaści. Hrošy-ž ŭ kooperacyi patrebny tolki, kab rušycca z miesca.

Usiu spravu arhanizacyi kooperacyi apirać tolki na hrašoch liču niebiaśpiečnym jašče i z tej pryčyny, što stupień ekanamičnaj hramaty našaha hramadzianstva — nia tolki „masaŭ" ale i „viarchoŭ" — dahetul vielmi nizki. Z hrašovaj-ža haspadarkaj nierazłučna źviazany kredyt, jaki žjaŭlajecca zarezam dla tych, chto nia ŭmieje z im abchadzicca, chto nia viedaje pravoŭ, jakija kirujuć haspadarčym žyćciom. Pierš čym naležna haspadaryć pazyčanymi hrašmi, treba naŭčycca haspadaryć hrašmi svaimi. Kali my ich budziem mieć? — inšaja reč. Ale zdabyŭšy, u pieršuju čarhu treba źviarnuć ich na arhanizacyju svajho kooperatyŭnaha centru, paśla — na kursy dla kooperatyŭnych pracaŭnikoŭ, na vydaviectva kooperatyŭnaj literatury i presy, i tolki na astatku možna z vialikaju aściarožnaściu dać pazyčku dobraj kooperatyvie.—U pieršuju čarhu treba adnak padbać ab pryhatavańni ludziej!

Prajekt biespracentnaha składańnia składak u Kooperatyŭnym Fondzie liču susiom nierealnym. Z kooperacyi nia možna rabić niejkaha dabradziejnaha tavarystva.

M. S.

ходу брутто 736.890 зл. Гадавы білянс выказаў надвыжку ў суме 3.167 зл. 54 гр. Собскі фонд „Масласаюзу" выносіць 473.554 зл., чужы—605.328 зл.; стасунак собскіх фондаў да чужых=1:1.28. — Адміністрацыйныя кошты ў мінулым годзе, у параўнаньні з 1931 годам, абніжыліся на 10.53 проц.

Цэлы леташні год для ўкраінскага, як і кожнага іншага малачарства гэта, з аднаго боку напор крызысу, а з другога — дзейнае супроцьстаўляньне гэтаму напору. У украінскай малачарскай коопэрацыі з часам быў выпрацаваны спосаб гэткага супроцьстаўляньня, які палягае на тым, што **чым больш націскае крызыс, тым больш узрастае дастава малака ў малачарні ад паасобных гаспадароў,** а паасобныя малыя малачарні лучацца ў адну вялікую малачарню на цэлы район (вокруг, абшар). Лучацца гэтак ў аднэй районнай (акружной) малачарні ад 15-цёх да 25—30-цёх і больш сёлаў так, што ў дзень зьбіраецца да перароблі ня менш 2.000(двух тысяч) літраў малака. Украінскія коопэратары—малачары паставілі сабе за мэту, каб дзенная дастава і перароблка малака ў кожнай районнай малачарні дайшла цыфры 5.000 (пяцёх тысяч) літраў.

Жыцьцё паказала, што гэткія іменна акружныя малачарні нават у час крызысу ня толькі не ўпадаюць, але наадварот — самі сабой добра разьвіваюцца і, карыстаючы з упадку малачарняў малых, займаюць іхняе месца. Увесь сакрэт гэтага як-ні-як цікавага явішча знаходзіцца ў тым, што абніжка цэнаў на самае масла ў малых малачарнях адбіваецца сваім цяжарам зараз-жа на выплаце сялянам за дастаўленае імі малако. У вялікіх-жа (акружных) малачарнях гэткая абніжка раскладваецца і на кошты вырабу, якія тут незраўнана ніжэйшыя ад коштаў у малачарнях малых, аднасельскіх. Гэта дае магчымасьць акружным малачарням выплачваць сваім пайшчыкам вышэйшую цану за дастаўленае малако. Самі пайшчыкі гэткіх коопэратываў астаюцца ім вернымі, падчас калі пайшчыкі коопэратываў малых звычайна перастаюць аддаваць ім сваё малако, як толькі гэта коопэратыва змушана бывае абніжыць выплату: гэтак упадак малой коопэратыўнай малачарні толькі прысьпяшаецца.— Гэта ўсё украінскае малачарства „Маслосоюзу" мае на ўвеце і ўсімі сіламі стараецца скомасаваць дробныя малачарні ў малачарні акружныя. Новых малачарняў дзеля гэтага ў мінулым годзе „Масласаюз" адчыніў толькі шэсьць: адну — на перароблку малака на масла, а пяць — на продаж самага малака. Выпрацаваны пры

Technokracyja.

Niamiłasernyja kleščy sučasnaha kryzysu, jaki niačuvana naciskaje na krainu prykładnaha kapitalizmu — Ameryku, zmušaje jaje šukać vychadu. Bo-ž žarty małyja: biezraboćcie ŭściaž raście, a „śviatoje-śviatych" dla amerykanca — dolar valicca. I Ameryka pracuje, pracuje nie ad siahońnia. Paśla tayloryzacyi, standaryzacyi, racijanalizacyi pryšła na paradak dzienny technokracyja. Što ž technokracyja saboj pradstaŭlaje?

Na razie niama jšče ścisłaj formy, u jakuju možna było-b źmiaścić novy hety kirunak ludzkoj dumki, usio jašče ŭ stanie farmavańnia. Navat dumki samych tvarcoŭ technokracyi jšče nia ŭstalenyja. Kažuć tolki, što pry sučasnym ładzie mašyna chutka zamienić rabotnika taksama, jak prad sto hadami mator zamianiŭ kania. Da hetkich vysnaŭkaŭ dajšli amerykanskija vučonyja na asnovie dziesiaci-hadovaj cichaj pracy (1920—1930). Padličana pry hetym, što karystajučysia sučasnymi mašynami amerykancy mohuć vyrabić sabie ŭsio patrebnaje, kali kožny z ich, mužčyny i žančyny, u vieku 25—45 hadoŭ budzie pracavać u tydzień usiaho pa 15 hadzin. Bo-ž treba viedać, što ziemlarob, kali-b moh siańnia karystacca ŭsimi patrebnymi mašynami, dyk za adnu hadzinu času moh-by zrabić toje, na što prad sto hadami treba było 3.000 hadzin (217 rabočych dzion pa 12 hadzin kožny). Sučasnyja fabryki abutku ŭ Złuč. Štatach Paŭn. Ameryki za 10 mies. mohuć siańnia vyrabić hetulki tavaru, što jaho chopić dla ŭsich žycharoŭ dziaržavy na 10 hod.

Pahonnaj siłaj, ci stracham, jaki zmušaje technokrataŭ da pracy, jość uściaž daskanalenaja mašyna, jakaja dasłoŭna vypichaje čałavieka. To-ž u tej samaj Amerycy budujecca naprykład fabryka štučnaha jadvabu, hdzie buduć ustaŭleny mašyny, jakija całuju paru (sutki, 24 hadziny) buduć mahčy pracavać susim biaz učaścia čałavieka. — Hetkim zdaŭsia dahetulašni śviet dla amerykanskich vučonych i jany ćvierdziać, što kali žyćcio budzie jšci dahetulašnim toram, dyk treba spadziavacca ŭžo nia kryzysu, ale sapraŭdnaj katastrofy. Uzamien za dahetulašni ład monetarnaj kalkulacyi (vyceńvańnia ludzkoj pracy u hrašoch), technokraty prapanujuć pieraacencku ŭsich vartaściaŭ pavodle taho mnostva energii (siły), jakuju treba było zužyć na ichnaje vytvareńnie.

Praca ŭ hetym kirunku jšče daloka nia končana; jana pabolšvajecca jšče na doślady nad tym, jak pradukcyja ŭściaž uzrastaje i jak źmianšajecca zapatrebavańnie rabotnickich sił, patrebnych dziela vykonyvańnia taho samaha fizyčnaha dabra. — Słovam, praca ŭ poŭnym razhary.

Pavodle technokrataŭ, kab nia było nadbytku pradukcyi, treba jaje padličyć, datarnavać da spažyćcia, a hetym samym „usia haspadarča-hramadzkaja dziejnaść pavinna być padparadkavana zakonam fizyki". U praktycy-ž hetyja zakony musiać tłumačyć i zastasovyvać

гэтым новы тып акружной малачарні для даставы поўнага малака. Арганізацыйныя засады гэтых малачарняў тыясамыя, што і малачарняў для вырабу масла. Абавязвае тойсамы статут і тая-ж вышыня паю--25 зл. Розьніца ў тым толькі, што з сабраных паёў акружная малачарня пакідае ў сябе толькі па 5 зл. ад кожнага і ўпісовыя, а рэшту перадае ў „Масласаюз", рахуючы адзін пай на кожных пяць кароў.

Комасацыя (зцаленьне) дробных малачарняў у акружныя, будаваньне самых малачарскіх будынкаў і асабліва абслужэньне гэтых малачарняў адпаведнымі машынамі і нагул малачарскай снасьцю,—усё гэта патрабуе вялікіх капіталаў. Вось-жа „Масласаюз" кінуў кліч зьбіраньня ашчаднасьцяў на гэтак званы Фонд разбудовы коопэратыўнага малачарства. Каб зьбіраньне грошы не расьцярушваліся, „Масласаюз" наказаў зьбіраць іх у адно месца, у „Цэнтробанк," куды за мінулы год і было сабрана на гэту мэту 4.832 амэр. даляры.

Трэба ўрэшце прыпомніць аб поступах саматугам ведзенай кантролі малочнасьці. Сцьверджана пры гэтым, што тыя гаспадары, якія сьцісла падпарадкоўваліся кантролі праз цэлы час, за год ад аднэй каровы мелі надвыжкі 106 зл.; хто падпарадкоўваўся толькі часткова—меў надвыжкі 55 зл., а хто ня меў досыць пашы патрэбнай да корму — той астаўся з 12 зл. страты ад аднэй каровы за год. І тут яўная карысьць для тых, хто ад пачатку да канца трымаецца свае арганізацыі.

Другім гаспадарчым цэнтрам украінцаў у межах сучаснай Польшчы ёсьць «Сільський Господар» —арганізацыя *фахова-земляробская*. Сёлета мінула роўна 35 год працы „С. Господар'а".

Прадваенная праца ў „С. Г." мела іншыя асновы, ад сучасных адменныя. Вайна гэту працу была блізу запыніўшы, так што з наступленьнем больш менш нармальных часоў прыходзілася пачынаць нанова, а галоўнае — апірацца толькі на свае народныя сілы. З скромных пачаткаў удалося аднак гэткім чынам дапрацавацца да дзівувартых рэзультатаў. Відаць гэта з штораз узрастаючага ліку гурткоў «С. Г.," якія множыліся і множацца нават у час гаспадарчага крызысу. Доказ гэта, што арганізацыя стаіць імення на сваіх нагах. І так, калі йшчэ ў 1927 г. было ў „С. Г." толькі 112 гурткоў, дык у 1928 — ужо 540, у 1929—1045, у 1930 — 1122, у 1931 — 1189 і ў 1932 — 1298. Тое-

techniki, inžyniery. Stul i nazova technokracyi. Kali-ž hetaha nia staniecca, kali ŭ pradukcyi nia budzie skasavanaja systema volnaha ŭzajemnaha vypiaredžvańnia, kali sučasnaja systema monetarnaj acenki nia budzie zamieniena na systemu energetyčnuju, dyk pavadyr amerykanskich technokrataŭ praf. Howard Scott (čytaj: skot) prarakuje ahulnuju i biazvyniatkovuju katastrofu, ruinu publičnaha ładu ŭžo na viasnu 1934 h.

Za hetkaje prarakavańnie H. Scotta pramysłoŭcy abvinavačvajuć jaho ŭ... balšaviźmie i prosta zakidvajuć jamu, što jon z Złuč. Štataŭ, Kanady i Meksyki choča stvaryć Sajuz Savieckich Respublik. Što cikaviejšaje, adumysłovaja kamisija b. prezydenta Hoovera prad tryma hadami jšče ŭ šmat čym zhadziłasia z vyvadami H. Scotta, a niesakret i toje, što šmat najbližejšych navat supracoŭnikaŭ sučasnaha prezydenta Roosevelta taksama naležać da technokrataŭ. — Usio heta havora za tym, što ŭ kapitalistyčnaj Amerycy naśpiavaje niešta novaje.

Kooperatyŭny śviet hladzić na hetyja padziei nie biez zacikaŭleńnia: pryznaje, što technokraty zrobiać mnoha, kali pierakanajuć śviet, što kapitalictyčny ład pažyraje samoha siabie. Ale sama technokracyja heta jšče nie lakarstva. Kali technokraty pryčynu spadziavanaj katastrofy bačać u mašynie, dyk kooperatary kažuć, što **zamiest niawinnaj mašyny, što hetak vydajna pracuje, treba ŭziacca za jejnych ułaśnikaŭ**. Bo-ž mašyna nie pa toje isnuje, kab uzbahačvała i biez taho ŭžo bahatych jejnych ułaśnikaŭ, ale pa toje, kab ableħčyła pracu tych, što na joj pracujuć. Kali technokraty chočuć być ščyrymi, dyk musiać pryznać, što napravu treba pačać ad skasavańnia usiemahutnaści hrašej i naahuł kapitału.

Naahuł-ža ŭvieś śviet musić pryjści da pierakanańnia, što datul nia budzie supakoju, nia budzie ładu, pakul dla čałavieka — budź jon kapitalist, socyjalist ci kooperatyst — hrošy buduć nie samametaj, ale tolki srodkam. Bo ŭsia słabaść nie adnaho z pamiž „kooperatystaŭ" i „socyjalistaŭ" u tym imienna, što i jany „nienavidziać" kapitalizmu dziela taho tolki, što sami hetaha kapitału nia majuć. A poŭpraŭda horšaja, jak cełaje łharstva.

A. K.

Z kooperatyŭnaj presy.

Sami ab sabie.

Senior polskich kooperataraŭ, b. prezydent Polščy praf. St. Vajciechoŭski ŭ № 7 „Społem", u staćci p. n. „Nowe zakusy", pakazaŭšy na niebiaśpieku, jakaja pašla skasavańnia aŭtanomii vyšejšych škoł u Polščy pahražaje i aŭtanomii kooperatyŭnaha ruchu, miž inšym kaža ab vytvaranaj u Polščy sytuacyi hetak:

„Bo-ž natoŭpu ludziej u ŭradujučaj partyi nia možna ŭvažać, jak pryrodny pryrost dadatnych tvorčych siłaŭ. U Polščy nikoli nia było niedachopu kana-

---

самае з фаховым пэрсоналам (аграномамі), што кіруе працаю гэтых гурткоў. Рось-жа яшчэ ў 1930 г. гэткіх аграномаў было 12, у 1931 — ужо 15, а ў 1932 — аж 25.

Цікава, як украінскія сяляне ўтрымоўвуюць гэтых аграномаў: на аплату іх складаюцца ўсякія культурна-гаспадарчыя украінскія арганізацыі, якія працуюць у даным месцы, як П. С. К. (Паветавы Саюз Коопэратываў), адзел „Масласаюзу", Ашчадніцка-пазычковая каса, „Просвіта," „Рідна Школа," „Союз Украінок" і г. д. Усе гэтыя арганізацыі разам твораць г. зв. Арганізацыйную сэкцыю, якая і стараецца як аб грашох, так апрацоўвуе і сам плян працы для гуртка.

Важнай справай у жыцьці і працы «С. Г.-ра» зьяўляецца выдавецтва і пашыраньне сваей фахова-земляробскай часопісі — двутыднёвіка пад тым-жа назовам „Сільський Господар." Гэтай часопісі расходзіцца цяпер кругла 10.000 экзэмпляраў кожнага нумару; з гэтай лічбы роўна 7.000 экзэмпляраў ідзець да падпішчыкаў праз коопэратывы.

Наагул паміж украінскай коопэрацыяй і „Сільським Господарем" існуе цесная сувязь і супрацоўніцтва: карыстаюць згэтуль абедзьве стараны.—Гэта сувязь відаць з наступных пастановаў-забавязаньняў:

1. кожная коопэратыва мусіць (згодна з статутам) быць сябрам «Сіль. Госп." і заплаціць гадавую складку 10 зл.

2. кожная коопэратыва павінна сабраць прынамся 10 падпішчыкаў часопісі „Сіль. Госп.", каб пашыраць такім чынам фаховую земляробскую асьвету і гэтым самым памагаць сваі 1 сябрам сялянам; коопэратывы могуць выпісаць адпаведную колькасьць экзэмпляроў „С. Г." на свой рахунак і раздаваць іх пасьля замест гадавых зваротаў за закупы;

3. гурткі „С. Госп.", разам з коопэр. малачарнямі, арганізоўвуюць гурткі кантролі малочнасьці;

4. супольнымі сіламі арганізоўвуецца фонд дзеля ўтрыманьня агранома, бо гдзе няма агранома, там ня можа быць і аграна-мічнай працы;

5. у кожным сяле мусіць быць чынны гурток «Сільського Господара."

Патрэбна ўсё гэта і нам, беларусам. Ніхто за нас гэтага ня зробіць — мусім за гэта брацца мы самі.

lijaŭ i karjerovičaŭ, hatovych supracoŭničać z kožnym uradam, aby tolki mahčy ciahnuć karyści z pryvilejaŭ uładańnia. Zatoje nie chapała ŭ Polščy ludziej tvorčych, zdolnych tvaryč i arhanizavać lepšaje hramadzkaje žyćcio sobskaj achviarnaściaj i pracaj. Hety niedachop asabliva silna adčuvajecca ciapier, kali ŭsio hetak płaščycca i podlicca, a starejšyja dziejačy schodziać u hrob abo viartajucca ŭ zacišša chatniaha žyćcia, źnieachvočanyja aviečym honam novaj generacyi (pakaleńnia), jakaja ŭva ŭsim šukaje dapamohi dziaržavy i finansavaj pomačy".

Dasłoŭna! Peŭna-ž, što svoj svaich znaje dobra. Nam ciešycca z hetakich vyvadaŭ niama čaho, ale vučycca treba kaniešna.

* * *

Kazionnaja kooperacyja i ŭsiakaja zamaskavanaja „dabradziejnaść“ na našych biełaruskich ziemlach nikoli nia mieła na voku sapraŭdnaj karyści biełaruskaha narodu, a tolki jahonuju škodu na karyść kaho inšaha. My ćvierdzili i ćvierdzim heta zaŭsiady, a anahdaj prahavaryŭsia ab hetym i sam orhan polskaj ziemlarobskaj kooperacyi „Czasopismo Spółdz. Rolniczych“ (№ 9/33). Voś-ža heta časopiś, pachvaliŭšy „achviarnuju pracu“ „niestrudzonej opiekunki Ziemi Wileńskiej Pani Premjerowej Prystorowej“ nad skuplivańniem pa našych vioskach pałotnaŭ i ŭsiakich inšych samadziełaŭ, dasłoŭna piša:

„..heta akcyja (skuplivańnie — red.) maje vialikaje značeńnie palityčnaje. — jana jość najlepšaj i najpładniejšaj prapahandaj polščyny „na Kresach Wschodnich“.. Śćvierdžana. što tam, hdzie adbyvajecca akcyja skuplivańnia pałatna, nasielnictva spraŭniej płacić padatki“ (uvypukleńnie naša — red.)

A znača: siej, čałavieča, lon, tčy pałatno i pradavaj jaho „achviarnym apiakunom“, katoryja ŭzamien za heta nakinuć tabie *čužuju palityku*, nakinuć *polščynu*, a z ciabie voźmuć *padatki*. Lepš-by musić nie pahładziŭ i barsuk svaich dziaciej.

Kooperatyŭnyja naviny.

Novaja kooperatyŭnaja małačarnia sarhanizavałasia ŭ kancy min. m-ca ŭ v. Vialikaje Padleśsie kala Lachavič, Baranavickaha pavietu. Nastroj i achvota da pracy ŭ arhanizataraŭ dobryja. Na ahulnym schodzie adrazu pastanoŭlena prystupić na siabru da Małačarskaha T-va ŭ Baranavičach, cieraz katoraje budzie vieścisia prodaž masła vyrablanaha ŭ małačarni.

U dobry čas!

— Jak uspamahaje ŭkrainskaja kooperacyja svaje kulturnyja i dabradziejnyja tavarystvy? U 1931 hodzie 1.256 ukrainskich kooperatyvaŭ vypłacili jak zapamohu i dar dla svaich-ža arhanizacyjaŭ sumu 120.455 zł. — Dla orjentacyi treba zaznačyć, što ŭ hety-ž čas było ŭsiaho 3.161 ukrainskaja kooperatyva 1-ha stupnia, z katorych 1.906 mieli bilansovuju nadvyžku ŭ ahulnaj sumie 1 126 798 zł. Vypłačanyja takim čynam u 1931 zapamohi i dary stanoviać 10.7 prac. bilansovaj nadvyžki za 1930 h.

— Śmierć praf. Gebharda. 28 lutaha s. h. u stalicy Finlandyi Helsinky pamior zakładčyk i harečy pravadnik ideoloh finskaha kooperatyŭnaha ruchu praf. Hans Gebhard.

Praf. Gebhard bolš tryccacioch hadoŭ žyćcia svajho prapracavaŭ u kooperacyi, pieradusim u kredytovaj. Niabožčyk byŭ adnym z zakładčykaŭ Centralnaha Sajuzu Kredytovych kooperatyvaŭ i pieršym dyrektaram hetaha Sajuzu. Pochodziŭ niabožčyk z biednaj sialanskaj siam'i. Dziakujučy adnak niazvyčajnym zdolnaściam i upornaj pracavitaści jon staŭsia prafesaram universytetu ŭ Helsinkach, dzie jaho zastała i niemiłasernaja śmierć.

— Dzień Kooperacyi sioleta prypadaje na niadzielu 11 červienia. Z taje pryčyny, što časopiś naša vychodzić u druhoj pałovie miesiaca, adpaviednuju staćciu ab značeńni kooperacyi źmieścim užo ŭ nastupnym numary „Samapomačy“ za m-c travień.

— „Для бліжніх“, drama z kooperatyŭnaha žyćcia ŭ 4-och dziejach, J. Kosaŭskaha, vyjšła ŭžo z druku. Knižka abymaje 56 bačyn i kaštuje tolki 40 hr. — Kupić i vypisać možna z kniharni „Pahonia“ ŭ Vilni—Zavalnaja 6.

Dyk ci nie za doraha abchodzicca nam heta „apieka“ i ci nie para skazać našym „achviarnym apiakunom“: „voś chamut vam, voś duha, a ja bolš vam nia słuha“? — Sapraŭdy, tak!

M.

Сельская гаспадарка.

Сарты садовіны

выбраныя Помолёгічнай Камісіяй для Віленшчыны, Наваградчыны, Беласточчыны і Палесься.

I. ВІЛЕНШЧЫНА.

Яблыні. Летнія: Папяроўка. **Васеньнія:** Бэржэніцкі ананас. Харламаўскія, Графштынак, Цітаўка, Струмілаўка. **Зімавыя:** Антонаўка, Глогераўка, Монтвілаўка. **Увага:** Глогераўку радзяць шчапіць двойчы.

Ігрушы. Для мяйсцовага толькі ужытку (не на продаж) найлепш адпавядаюць. Баўская Бэра, Беззярноўка, Бэргамотка, Ядвабніца, Віноўка.

Сьлівы. Для гандлёвай гадоўлі неадпаведныя. Для мяйсцовага ўжытку надаюцца: Белая сьліва, Белая Дамасцэна, Вікторыя.

II. НАВАГРАДЧЫНА.

Яблыні. Летнія: Жоўтая Аліўка. **Васеньнія:** Графштынак, Струмілаўка, Цітаўка. **Зімавыя:** Антонаўка, Каштэля. **Увага:** Каштэлю радзяць шчапіць двойчы.

Ігрушы: Не адпавядаюць для гандлёвай гадоўлі. Для мяйсцовага ужытку надаюцца: Баўская Бэра, Беззярноўка, Бэргамотка, Ядвабніца, Віноўка.

Сьлівы: Не адпавядаюць для гандлёвай гадоўлі. На мясцовы ўжытак надаюцца: Белая сьліва, Белая Дамасцэна, Вікторыя.

III БЕЛАСТОЧЧЫНА.

Яблыні. Летнія: Аліўка жоўтая. **Васеньнія:** Кронсэльскія. **Зімовыя:** Антонаўка, Бойкен, Глогераўка, Каштэля, Малінавыя Обэрляндзкія. **Увага:** Глогераўку і Каштэлю радзяць шчапіць падвойна.

Ігрушы: На мясцовы ужытак прапа-

нуюць: Баускую Бэру, Беззярноўку, Бэрга мотку, Ядвабніцу, Вішнёўку.

Сьлівы. Таксама толькі на мясцовы ўжытак: Белая сьліва, Белая Дамасцэна і Вікторыя.

IV. ПАЛЕСЬСЕ.

Яблыні. Летнія: Аліўка жоўтая. **Васеньнія:** Кронсэльскія. **Зімовыя:** Антонаўка, Каштэля. **Увага:** Каштэлю радзяць шчапіць двойчы.

Ігрушы: Бэргамотка, Слуцкая (бэра), Сабеская.

Сьлівы: Таксама як у папярэдніх.

Консэрваваньне яёк.

Кожнае яйко, а асабліва — курынае, мае высокую спажыўную вартасьць (роўную 40 грм. мяса), пакуль яно сьвежае. Яйко старэйшае *двух тыдняў* ужо гэтай вартасьці ня мае, а праз кароткі час і сусім псуецца. Прычынай гэтага зьяўляюцца сусім дробныя дзірачкі ў скарупцы яйка, праз якія аднак дастаецца ў сярэдзіну яйка паветра, а разам з ім і розныя шкодныя дробнатворы (бактэрыі), якія раскладаюць яечны бялок. Каб усьцерагчыся гэтай шкоды і самыя яйкі зрабіць больш трывалкімі, трэба іхную скарупку нечым такім аблажыць, ці абмазаць, што-б не прапускала ў сярэдзіну паветра. Спосабаў такога ўтрываленьня спажыўнае вартасьці яйка ёсьць некалькі і ўсе яны вядомы пад агульным назовам консэрваваньня. Да кожнага консэрваваньня прыгодны яйкі толькі сусім цэлыя і чыстыя. Брудныя яйкі прад консэрваваньнем трэба выцерці чыстай шматкай, змочанай у воцце.

Найтанейшым і найпрасьцейшым ёсьць консэрваваньне ў г. зв. вапеннай вадзе. Робіцца яна гэтак: насамперш прыгатаўляецца „малако". На 25 літраў вады даецца 1 клг. (2.5 фунты) паленай, але нягашанай вапны і раствор гэты з малымі прорвамі мяшаецца 3—5 дзён. Пасьля дадаецца 10 грм. звычайнай дробнай солі і ўзноў мяшаецца. Па 6—7 днях вада устоіваецца і зьліваецца ў чыстую судзіну, а мута пакідаецца. У зьлітую (празрыстую) вапенную ваду складаюцца асьцярожна яйкі прызначаныя да консэрваваньня. На 1 капу яёк трэба 4 літры вапеннай вады. Гэтак консэрваваныя яйкі можна ўжываць найлепш у цеста; да варэньня і да смажаньня яны менш прыгодны.

Лепшым, але і даражэйшым, ёсьць консэрваваньне яёк пры помачы воднага шкла (соднай краменянкі). На дзьве капы яёк трэба купіць у аптэцы, ці аптэчным складзе, 1 літр воднага шкла і распусьціць яго ў 8 літрах перагатаванай вады.

Якасьць консэрваваных яёк ёсьць тым лепшай, чым сьвяжэйшыя яйкі консэрвуюцца. Сьвежасьць яёк прабуецца гэтак: у 1 літр вады дамо 8 дкг. (80 грм.) кухоннай солі і ў гэты раствор укладаемо яйкі. Сьвежае яйко тоне, а старое — плывае. Каб яйко консэрваванае водным шклом не аддавала содай, яго трэба выняўшы з соленай вады (проба на сьвежасьць) намачыць у растворы хлёрку магнэзіі (150-200 грм. хлёрку магнэзіі на 1 літр вады) і пасьля толькі класьці ў раствор воднага шкла. с.

Студзіце малако!

Бяда як няма малака, але горшая бяда як гэта малако ёсьць, ды яно нярaз ідзе на марнае дзеля таго толькі, што нашы гаспадынькі не заўсёды адпаведна з ім абходзяцца, а то і сусім ня ўмеюць за яго ўзяцца. Няхай гэта нікога не абразіць, наадварот — хай заахвоціць да пазнаньня сваіх недастаткаў, а гэта будзе ўжо першым крокам да направы.

Як толькі пакажыцца досыць вясьнянае травы, каровы раздояцца, а сонца прыгрэе,— часта-густа чуваць тады нараканьне, што „малако псуецца", „чараўніца малако забрала," і г. д. — А чаму-ж гэта малако не псавалася зімой, а гдзе была зімой гэта ведзьма—чараўніца?

Не „залом", ня ведзьма, не воўкалакі, не благія вочы тут вінаваты, але дробныя-дробныя жыватворы, якія ў малацэ разводзяцца з нячуванай сілай, у нявіданым мностве, калі гэта малако пастаіць нейкі час у цеплаце 20-35°C, г. зн. у такой, у якой яно знаходзіцца зараз беспасярэдна пасьля ўдою. Зімой гэта цеплата сама сабой ападае і дзеля таго малако так хутка ня псуецца. І тут увесь сакрэт: астудзіце (ахаладзіце) малако ўлетку так, як яно само астывае узімку, тады ня будзе яно псавацца і ўлетку.

Але каторая-ж з гаспадынь прызнаецца, што яна малака пасьля ўдою не халодзіць?— Баяцца трэба, што ніводная.

Справа аднак у тым, як гэта халаджэньне адбываецца. — Па нашых вёсках адзіным і выключным спосабам халаджэньня ёсьць пастаўленьне сьвежа падоенага малака ў больш ці менш халоднай, але рэдка чыстай варыўні, ці нейкай там каморцы, у найлепшым разе—у лядоўні. Гэта ёсьць халаджэньне паветрам і найнавейшыя спробы паказалі, што яно для дакладнага астуджэньня не хапае. Данскія малачары рабілі гэткія пробы ў Дальму з адначасным халаджэньнем двух роўных збаноў малака: аднаго паветрам, а другога — вадой (цякучай). За 6 гадзін халаджэньня, малако, што стаяла не ў вадзе, з 35°C астудзілася толькі да 16¹/₄°C, тады як такое-ж малако і за той жа час, але пастаўленае ў вадзе астудзілася да 11³/₄°C. Што пры гэтым аднак важнейшае, гэта тое, што малако ўстаўленае ў ваду студзіцца

вельмі шыбка і ў кароткім часе пераскаківае праз небясьпечную цеплату (20—35°С), якая ўспамагае распладжываньне шкодных, ці хоцьбы толькі і непатрэбных (квасных) бактэрыяў. — Данскія земляробы устрайваюць гэткія халадзільні на панадворышчах, каля студняў і вельмі іх хваляць. Яны пераканаы, што абсолютная чыстата пры даеньні і ўтрымліваньні малака і дасканалая студжэньне яго — ёсьць сакрэтам іхнай славы ў сьвеце, а за тым і самага багацтва.

Нашым гаспадынькам трэба вучыцца халадзіць малако таксама; але адначасна трэба думаць і аб тым, як бы рэшту працы над пераробкай малака ўзлажыць на супольныя дзеля гэтага супалкі, на коопэратыўныя малачарні. Менш тады будзе працы, больш карысьці, а час, які траціцца ў кожнай гаспадарцы над малаком, можна будзе выкарыстаць для справаў іншых.

Пры ўсім гэтым трэба аднак памятаць, што з нястуджа нага ўлетку малака добрага і трывалкага масла, а тымбольш гэткіх-жа сыроў вырабіць ня можна. Дзеля таго у малачарскай гаспадарцы першым правілам мусіць быць як найстараньнейшае студжэньне (да 10°С) і абсалютная чыстасьць.

В. Вал.

Як арганізавалася коопэратыўная малачарня ў Вялікай-Ліпе Нясьвіскага павету.

Сарганізована малачарня наша ў 1929 г. а ў рух пушчана 1-га траўня таго-ж году. Першы год перарабіла яна 83.569,5 літраў малака, масла вырабіла 3.673 кілё. Агульны абарот за 1929 г. 19.727 зл. 44 гр.

Цікавы арганізацыйны пэрыяд гэтае малачарні. Два гады перад залажэньнем малачарні ў В. Ліпе ліпаўцы належалі да коопэратыўнае малачарні ў суседняй вёсцы Крутым Беразе. Дзеля таго што гаспадарылася там кепскавата, ліпаўцы пастанавілі абавязкава сарганізаваць малачарню у сябе, у Ліпе. Два выхады былі з палажэньня. Першы— ісьці на агульную зборку і большасьцю галасоў ухваліць, каб малачарня з Крутога Берагу была перанесена у В. Ліпу. Гэта не ўдалося.

Прышлося кідаць у Крутым Б. усё і пачынаць ад пачатку. І тут вось пачынаюцца нашы мытарствы. Інструктар рольны Тэрлецкі на агульнай зборцы ў Ліпе заявіў, што за ўсякую цану не дапусьціць да арганізацыі малачарні ў Ліпе. А трэба сказаць, што інструктар у тыя яшчэ часы меў у сялян давер і аўторытэт. Шмат было у Ліпе такіх, што трусілі. Аднак сабралася на зборку чалавек 25, падпісалі дэкларацыі. Мала гэтага,— падпісалі гваранцыйныя вэксалі на няустойку, кажды на 50 зл., злажылі іх у рукі ўправы малачарні і рашылі ісьці да мэты. — Першая перашкода: інструктар рольны піша у Акружны суд у Навагрудку, каб той ня ўпісваў у гандлёвы раестр нашае малачарні, бо яна быццам не разлічылася з Кр. Берагам і вельмі блізка ад яго знаходзіцца, усяго якіх 2 кілёмэтры. Ліпаўцы зьбіраюць грошы, высылаюць дэлегата і толькі пасьля доўгіх тлумачэньняў у судзе нарэшце абяцаюць там нашу малачарню зарэестраваць.

Адна перашкода пераможана. Але гэтаму не канец. Яшчэ ў Крутым Беразе на гадавой зборцы малачарні люстратар з Рэвізыйнага Саюзу нам сказаў, што нашая малачарня хіба будзе дзікая, бо ў саюз коопэратыўны нас ніхто ня прыйме. А мы ведаем што гэта значыць быць „дзікімі“. Што рабіць? Прасіцца ў Рэвізыйны Саюз нам нават і думаць няма чаго. Астаецца прасіцца у уніятаў*) Але і тут нас папярэдзілі: управа крутабярэскае малачарні напісала да уніяцкага коопэратыўнага саюзу, што Вялікая Ліпа арганізавала малачарню вельмі блізка каля іх, усяго якіх два кілёмэтры і што з ліпаўскае малачарні ўсё роўна нічога ня будзе, а толькі пацярпіць моцна малачарня у Кр. Беразе і просяць ня прымаць да свайго саюзу Ліпы. Уніяты аднак не паслухалі, хоць да свайго саюзу адразу нас і не прынялі: напісалі ў Ліпу, што будуць апекавацца нашаю малачарняю, а прыняць у саюз могуць толькі пасьля першае рэвізіі.

Лічым, што і гэтая справа ўжо скончана. — Але тут вылазіць для нас узноў перашкода. Толькі прайшло якіх дзьве нядзелі, як пусьцілі ў рух сваю малачарню, аж атрымоўвуе наш кіраўнік малачарні з ваяводзкага саюзу „кулак рольнічых“ наказ, каб зараз-жа пакідаў Ліпу і ехаў у новасарганізованую малачарню ў Грузкова.

Трэба сказаць, што кандыдатаў на кіраўнікоў малачарняў у той час было яшчэ вельмі мала і ўсе яны былі залежнымі ад ваяводзкага „звёнзку“ папершае дзеля таго, што мелі стыпэндыі і мусілі там служыць, дзе ім скажуць, а падругое, адразу з курсаў ім выдавалася толькі тымчасовае пасьведчаньне аб сканчэньні курсу. Настаяшчы дакумант маглі яны атрымаць толькі пасьля першае рэвізыі і дадатковага экзаміну на сталым курсе малачарскім пры земляробскай школе ў Нягневічах. Адным словам кіраўнік наш выбіраецца у Грузкова, а нам грозіць астаноўка малачарні у самы разгар работы.

Пасьля доўгіх перагавораў з кіраўнікам і пераплаціўшы яму якіх 50 зл. на месяц,

*) Тэрміны „уніяты,“ „уніяцкі“ аўтор гэтае карэспандэнцыі ужывае ня ў сэнсе конфэсыйным, а як азнаку прыналежнасьці да польскага саюзу „Unja Związków Zarobkowych“. — рэд.

Redaktar-Vydaviec inž. A. KLIMOVIČ.

Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny, Vilnia, Zavalnaja 6—10.

удалося нам нарэшце проці волі Навагрудкә, кіраўніка затрымаць і працаваць далей.

Бачаць паны, што нічога ліпаўцаў не ўстрашае, дык кінуліся яшчэ на адзін спосаб, хоць ужо для Ліпы зусім ня страшны.

Рэч у тым, што крутобярэская малачарня выстараўшыся была з Банку Рольнага пазычкі на каровы. Атрымалі гэтую пазычку на трыгадовы срок сплаты і ліпаўцы, як сябры малачарні у Кр. Беразе. Але як толькі сарганізавалася ў Ліпе малачарня, дык каб ставіць ей лішнюю сьпіцу, Крутабярэскія сьцягваюць гэтую пазычку не за тры гады, але за тры месяцы.

Але і тут, як тая прыказка кажа — **Бог не бяз міласьці, а сьвет не бяз добрых людзей:** пішам у саюз Уніяцкі ў Вільню, а яны адтуль у Нясьвіж у Банк Людовы, каб банк выдаў ліпаўцам, сябром малачарні, пазычку на сплату пазычкі гадаўлянае у касу ў Гародзеі (каторая раздавала пазычкі гадаўляныя).

Такім чынам перамаглі ліпаўцы ўсе перашкоды і год перәпрацавалі бяз ніякіх страт.

Вывад з усяго гэтага можа быць гэтакі: дзе людзі хочуць, то можна сарганізаваць усё. Але грунт — трэба з а х а ц е ц ь. Цэлая армія інструктароў рольных нічога ня можа зрабіць у нашых варунках. У нас гэтыя інструктары ўсімі сіламі перашкаджалі, Крутому Берагу ўсімі сіламі памагалі. А вынік: Ліпа ўзмоцнілася і жыва і сягоньня, а Круты—Бераг— упаў.

Хай добра прызадумаецца над гэтым беларуская мягкацелая інтэлігенцыя, каторая умее гэтак хараша ўздыхаць і бядаваць аб сялянскай нядолі ды сьніць аб цёплых і сытых міністэрскіх пасадах у незалежнай Беларусі. Трэба ўзяцца да работы дробнае, шэрае ў беларускай коопэрацыі, а вынік работы доўга на сябе чакаць ня змусіць. Бо маем прыклад жывы. Трэба толькі **хацець.**

Дык усе, хто чуецца беларусам, да работы у беларускай коопэрацыі. М. С.

Гаспадарчая хроніка.

У п а д а к г а н д л ю і п р о м ы с л у н а н а ш ы х з е м л я х. Паводле даных Статыстычнага Бюра да канца м-ца лютага с. г. на абшары Віленскай Прамыслова-Гандлёвай Палаты (Віленшчына, Навагрудчына, Беласточчына, Палесьсе) лічба выкупленых прамысловых картаў (сьвядэцтво) дайшла 39.500, падчас калі летась у гэтай парэ было выкуплена гэтых-жа картаў 42.923; упадак — 3.423 карты становіць 8.4 прац. Найбольшы пры гэтым упадак зазначыўся ў Беласточчыне — 10.2 прац., а найменшы ў Навагрудчыне — 5.7 прац.

— Д о л я р з а х і с т а ў с я. 20 г. м. увесь фінансавы сьвет устрывожыўся абніжкай непарушнага дагэтуль доляра. Замест дагэтуляшняга курсу 8.90 зл. за доляр, 21 г. м. плацілі ўжо толькі 7.80 зл. —

Апошнім часам курс доляра узноў вельмі нявыразны.

ЦЭНЫ Ў ВІЛЬНІ

паводле нотаваньняў Віленскай збажжова-таварнай і льнярскай бурсы з 19 да 24.IV 33 г. за 100 кілё; тавар сярэдняй якасьці

Жыта мяшанае —ад 20.50 да 20 75 зл.; пшаніца мяшаная ад 33 да 35.50; ячмень ад — да —; авёс ад 14 да 15.50; мука жытняя 55 прац. ад 33.50 да 34.00; мука жытняя 65 прац. ад 28.50 да 29.00 зл.; мука разовая ад 23.50 да 24.00 зл.; мука сітняя — 23.00; мука пшонная 0000 — 60.00; крупы грэчныя 1/1 паленыя 42.00; пансак ячменны —; жытнія вотрубы ад 9.59 да 10.50; вотрубы пшанічныя ад 10.50 да 10.75 зл.; грэчка 20.40 зл.; фасоля белая —; лён трапаны друйскі (за 1000 кілё) ад 1071 зл. 67 гр. да 1093 зл. 32 гр.; лён трапаны валожынскі ад 1255 зл. 70 гр. да 1280 зл. 92 гр.; лён трапаны докшыцкі ад 1191 зл. 74 гр. да 1203 зл. 22 гр.; лён трапаны трабскі ад 1309 зл. 82 да 1331 зл. 47 гр. Лён часаны скәля 303,10 ад 1980 зл. 97 гр. да 2002 зл. 62 гр.; льнянае семя 90 прац. ад 38.00 да 39.00 зл..

Макухі (на Курляндзкай алеярні): за 100 кілё льняных — 21.00 зл., сланэчнікавых — 17.00 Зл..

Малочнае (паводле нотаваньняў Віленскага малачарскага саюзу з 19.IV.33 г.: масла найлепшае за 1 кілё ў гурце ад 4.30 да 4.40 зл., у дэталю — 4.80; масла сталовае у гурце ад 4.10 да 4.20 зл., у дэталю — 4.60 зл.; масла соленае ў гурце—3.00 зл, у дэталю — 3.30 зл.; сыры з твварагу за кілё у гурце — 1.25 зл., у дэталю — 1.40 зл.; сыры літоўскія за кілё ў гурце ад 2.00 да 2.60, у дэталю ад 2.20 да 2.80 зл.; яйкі за капу ад 3.30 да 5.40 зл., за штуку ад 7 да 10 гр..

Мёд за кілё ў гурце ад 1.80 да 2.20 зл., у дэталю ад 2.00 да 2.40 зл..

Грошы дн. 25.IV.33 г. у абаротах прыватных за доляр — 8.11 да 7.95 зл.; за рубель золатам—4.83 зл.

Pierasyłka apłačana ryčałtam.



CANA NUMARU 40 HRAŠOŬ